ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
ўстановы адукацыі "Беларускі
дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка"
__________ С.М. Феклістава

11 снежня 2023 г.

**ВОДЗЫЎ**

апаніруючай арганізацыі на дысертацыю
Ненадаўца Ягора Аляксеевіча "Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць", прадстаўленую на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка

**ПРЫСУТНІЧАЛІ**: доктар філалагічных навук В.Д. Старычонак, доктар філалагічных навук Т.М. Тарасава, доктар філалагічных навук Т.Я. Камароўская, кандыдат філалагічных навук І.М. Мішчанчук, кандыдат філалагічных навук А.У. Гранкіна, кандыдат філалагічных навук А.П. Жыганава, кандыдат філалагічных навук Н.В. Заяц, кандыдат філалагічных навук Н.А. Развадоўская, кандыдат філалагічных навук Н.Л. Сяржант, кандыдат філалагічных навук Т.П. Хоміч.

**СЛУХАЛІ**: даклад Я.А. Ненадаўца аб асноўных палажэннях і выніках дысертацыйнага даследавання "Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць", прадстаўленага на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка.

**ВЫСТУПІЛІ**: эксперт, прызначаны загадам рэктара БДПУ № 2709 л ад 5 снежня 2023 г. для правядзення экспертызы дысертацыі "Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць", кандыдат філалагічных навук М.А. Шатарава, прапанавала праект водзыва і абгрунтавала адлюстраваныя ў ім вывады.

**ПАСТАНАВІЛІ**:

На падставе вынікаў галасавання (за – 10, супраць – няма, устрымаліся – няма) зацвердзіць водзыў апаніруючай арганізацыі на дысертацыйнае даследаванне Я.А. Ненадаўца "Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць", прадстаўленае на саісканне вучонай

ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.09 – фальклярыстыка.

**1. Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.**

Дысертацыя Я.А. Ненадаўца "Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць", прадстаўленая на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук, па сфармуляванай праблеме, пастаўленых задачах і разглядаемым тэкставым матэрыяле адпавядае заяўленай галіне навукі (філалогія) і спецыяльнасці 10.01.09 – фальклярыстыка.

**2. Навуковы ўклад саіскальніка ў вырашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці.**

Дысертацыя Я.А. Ненадаўца прысвечана даследаванню воднай прасторы ў традыцыйнай культуры і фальклоры беларусаў, увасобленай у міфапаэтычных уяўленнях, калектыўных і індывідуальных магічна-абрадавых практыках, атрыбутыцы і славесных формулах. Распрацоўка гэтай тэмы мае значэнне для акадэмічнай навукі, паколькі звяртае фокус даследчыцкай увагі на самабытныя з'явы абрадавай культуры, звязаныя з міфалагічнай свядомасцю і фальклорнымі механізмамі наладжвання жыццядзейнасці і пераадолення крызісных станаў грамадства. Да вывучэння адлюстравання воднай прасторы ў беларускім фальклоры апошнім часам звярталіся вядомыя даследчыкі (А.Алфёрава, В.Новак, А.Кастрыца, У.Лобач, М.Антропаў і іншыя), але яна яшчэ не рабілася прадметам спецыяльнага філалагічнага даследавання.

Упершыню ў айчыннай фальклярыстыцы вызначана і прааналізавана атрыбутыка і прэдыкатыўнасць водных сімвалаў беларускага фальклору, разгледжана іх роля пры ўтварэнні светабудовы, захаванасць згаданай тэматыкі ў фальклорных творах. Водная прастора ўпершыню становіцца асобным аб'ектам разгляду беларускай этнафальклярыстыкі, які раней у сувязі з абраным прадметам даследавання вывучаўся ў галінах розных навук – этналінгвістыцы, этнаграфіі, міфалогіі, фальклярыстыцы, семіётыцы, культуралогіі. Акцэнтавана ўвага на вадзе не толькі як адной з галоўных стыхій, але і як сродку дапамогі ў розных жыццёвых сітуацыях.

Важнасць даследавання воднай прасторы ў фальклоры вызначаецца і наяўнасцю запісаў (у тым ліку і асабістых саіскальніка), якія яшчэ не ўведзены ў навуковы зварот, аднак утрымліваюць каштоўныя звесткі пра фальклорныя архетыпы і традыцыі, звязаныя з воднай стыхіяй, і выпрацоўку чалавекам механізмаў уздзеяння на яе. Тэарэтычнае асэнсаванне семантыкі і сюжэтаў воднай прасторы ў шырокім кантэксце традыцыйнай культуры мае важнае значэнне і таму, што дазваляе вызначыць узровень захаванасці гэтага архаічнага пласта беларускай традыцыйнай культуры, а таксама магчымасці і перспектывы яе сучаснага ўвасаблення і бытавання, паколькі вывучэнне воднай прасторы сёння не звернута толькі ў мінулае. У сучаснай культуры рэгіёнаў Беларусі

захоўваюцца ўнікальныя абрады і іх мадыфікаваныя формы, звязаныя з вадой (“зямной” і “нябеснай”). Пра неабходнасць іх захавання, вывучэння і трансляцыі сведчыць статус асобных абрадаў у Спісе элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Гэтым акрэсліваецца актуальнасць і сацыяльная значнасць работы Я.А. Ненадаўца.

**3. Канкрэтныя навуковыя вынікі (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана навуковая ступень.**

Дысертацыя з’яўляецца арыгінальным даследаваннем воднай прасторы ў беларускім фальклоры, выкананым на тэарэтычным і фактычным матэрыяле, апублікаваным у працах класікаў народазнаўства і фалькларыстыкі XIX – пачатку XX стст. і ў сучасных навуковых выданнях. Аўтарам выкарыстаны таксама шэраг уласных палявых матэрыялаў, сабраных падчас фальклорных экспедыцый (2004-2023 гг.). Даставернасць і абгрунтаванасць вынікаў праведзенага даследавання забяспечваецца: зыходнымі метадалагічнымі пазіцыямі; комплексным выкарыстаннем тэарэтычных і эмпірычных метадаў даследавання, адэкватных мэце, задачам, аб’екту і прадмету даследавання; шматбаковым аналізам навуковай літаратуры.

Я.А. Ненадавец комплексна даследаваў вобраз воднай прасторы ў беларускай міфалогіі і вуснапаэтычнай творчасці праз інтэрпрэтацыю аб’екта вывучэння як сістэмы і выяўленне семантыкі і функцый яго базавых кампанентаў. У дысертацыйнай працы акрэслена месца воднай прасторы ў сістэме каляндарных і сямейных абрадаў (с. 22–43), прааналізаваны комплекс “жывой” і “мёртвай вады” ў чарадзейных казках і замовах (с. 43–68), разгледжаны функцыянальны і аксіялагічныя аспекты воднай прасторы ў вуснай народнай творчасці беларусаў (вобраз вады ў малых жанрах, святыя азёры і крыніцы, вобраз ракі Дунай) (с. 68–106).

Такім чынам, Я.А. Ненадавец унёс пэўны ўклад у распрацоўку праблем міфапаэтыкі, структуры і жанравай прыроды воднай прасторы беларускага фальклору. Практычная значнасць даследавання Я.А. Ненадаўца заключаецца ў тым, што асобныя часткі дысертацыі атрымалі ўкараненне ў адукацыйным працэсе сярэдняй і вышэйшай школы, аб чым сведчаць адпаведныя акты. Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны для далейшай канцэптуальнай распрацоўкі і ўзбагачэння фактычнага матэрыялу вучэбных дысцыплін у галіне традыцыйнай культуры і фальклору беларусаў, пры напісанні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, у самастойнай працы магістрантаў, студэнтаў, пры падрыхтоўцы асобных лекцый або спецыялізаваных курсаў для шырокай аўдыторыі.

**4. Заўвагі і прапановы.**

Нягледзячы на агульны высокі ўзровень даследавання, у ім сустракаюцца асобныя моманты, якія патрабуюць удакладнення або каменціравання саіскальніка:

1. Патрабуе ўдакладнення фармулёўка аб'екта і прадмета даследавання, паколькі назіраецца іх неадпаведнасць у дысертацыі і аўтарэфераце.

2. У раздзеле дысертацыі "Навуковая навізна" пазначана, што раскрыты "дамінантныя прыкметы" павер'яў пра ваду, "прычыны і напрамкі трансфармацыі беларускіх абрадаў і жанраў фальклору, звязаных з вадой", "раскрыты адметнасці мастацкіх сродкаў вербальных тэкстаў беларускай народнай творчасці" (с. 7). Аднак дадзеныя аспекты не знайшлі свайго адлюстравання ў палажэннях, якія выносяцца на абарону, а таксама ў заключэнні дысертацыі.

3. У параграфе 2.1 "Семантыка і знакавасць воднай прасторы ў сферы каляндарнай абраднасці" саіскальнік разглядае толькі абрады выклікання дажджу. Па-першае, сярод каляндарных абрадаў ёсць дастатковая колькасць і іншых, якія заснаваны на выкарыстанні вады (як сімвала, як сродку, як атрыбута і г.д.). Напрыклад, рытуалы на Купалле, на Троіцу і інш. Па-другое, абрады выклікання дажджу адносяцца да аказіянальных, паколькі маюць сваю вызначальную спецыфіку, якая іх адрознівае ад каляндарных.

4. Па-за ўвагай саіскальніка засталіся важныя ў тэарэтычным аспекце працы, якія па нейкіх прычынах у дысертацыі не ўзгадваюцца. Гэта даследаванні айчынных навукоўцаў А.В Катовіч, А.А. Кастрыцы, даволі мала разгледжаны працы расійскіх даследчыкаў М.І. і С.М. Талстых (толькі «Вызывание дождя в Полесье»).

Выказаныя заўвагі не зніжаюць навуковага ўзроўню дысертацыі і яе каштоўнасці.

**5. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Дысертацыя Я.А. Ненадаўца "Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць" з'яўляецца завершанай, самастойна выкананай, кваліфікацыйнай навуковай работай і адпавядае ўсім патрабаванням. Згодна з п.п. 20, 21 "Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні навуковых званняў у Рэспубліцы Беларусь" вучоная ступень кандыдата філалагічных навук Ягору Аляксеевічу Ненадаўцу можа быць прысуджана за:

1) комплекснае даследаванне вобраза воднай прасторы ў нацыянальнай міфалогіі і вуснапаэтычнай творчасці з вызначэннем спецыфікі фарміравання канцэпта вады ў беларускім фальклоры;

2) вызначэнне і аналіз атрыбутыкі і прэдыкатыўнасці водных сімвалаў беларускай міфалогіі і традыцыйнага фальклору;

3) вылучэнне функцыянальных і аксіялагічных асноў вобраза вады ў традыцыйнай культуры беларусаў, абгрунтаванне яго ўплыву на фарміраванне міфапаэтычных уяўленняў пра сувязі чалавека з прыродай;

4) актуалізацыю і ўвядзенне ў навуковы зварот новых фактаў абрадавай традыцыі, звязанай з воднай прасторай і яе вобразнымі ўвасабленнямі.

Высокі ўзровень дысертацыйнага даследавання, значная публікацыйная актыўнасць (26 пазіцый), удзел аўтара ў навуковых канферэнцыях (13) сведчаць пра адпаведнасць Я.А. Ненадаўца навуковай кваліфікацыі кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка.

У адпаведнасці з “Палажэннем аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні навуковых званняў у Рэспубліцы Беларусь” саіскальнік вучонай ступені кандыдата філалагічных навук Я.А. Ненадавец выступіў на пасяджэнні праблемнага савета БДПУ па філалагічных навуках з дакладам па тэме дысертацыі, адказаў на зададзеныя пытанні.

Падрыхтаваны экспертам праект водзыву на дысертацыю Я.А. Ненадаўца “Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць” быў заслуханы і абмеркаваны на праблемным савеце па філалагічных навуках БДПУ.

Водзыў зацверджаны на пасяджэнні праблемнага савета па філалагічных навуках установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” (пратакол № 6 ад 11 снежня 2023 года).

Старшыня праблемнага савета БДПУ
па філалагічных навуках
доктар філалагічных навук,
прафесар — В.Д. Старычонак

Сакратар праблемнага савета БДПУ
па філалагічных навуках
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт — В.М. Лухверчык

Эксперт
кандыдат філалагічных навук — М.А. Шатарава

Старычонак В.Д., Лухверчык В.М., Шатарава М.А.
Спецыяліст ... начальніка АК БДПУ
... С.В. Пенітанка
11.12.2023